УДК 373.2.011.3-051:[37.018.46:39]

# ЭТНАКУЛЬТУРНАЯ ПАДРЫХТОЎКА ПЕДАГОГАЎ УСТАНОЎ ДАШКОЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ПРАЦЭССЕ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ

*Кахноўская Алена Вячаславаўна,*
*Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М. Танка,*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
kohnovski@tut.by

*У артыкуле раскрываецца сутнасць этнакультурнай падрыхтоўкі педагогаў установы дашкольнай адукацыі ў працэсе павышэння кваліфікацыі, прапануецца вучэбна-тэматычны план адукацыйнага курса для педагогаў па аднаму з накірункаў вышэйзгаданай праблемы.*

*Ключавыя словы: этнапедагагічная культура, установа дашкольнай адукацыі.*

# ETHNO-CULTURAL TRAINING OF TEACHERS OF PRESCHOOL INSTITUTIONS AND ANALYSIS OF SKILLS DEVELOPMENT

*Elena Kohnovskaya,*
*Institute of advanced training and retraining of the Belarusian State Pedagogical University named after M. Tank,*
*Minsk, Republic of Belarus*
kohnovski@tut.by

*The article reveals the essence of the ethnocultural training of teachers of the preschool education establishment in the process of professional development, the curriculum for the educational course for teachers is proposed in one of the directions of the above-mentioned problem.*

*Key words: ethnopedagogical culture, preschool education establishment.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адным з актуальных напрамкаў сучаснай сістэмы дашкольнай адукацыі выступае выхаванне асобы на аснове народных культурных традыцый, выкарыстанне ў адукацыйным працэсе этнічнай педагогікі беларусаў. Відавочна, што адукацыя набывае этнапедагагічную накіраванасць і арыентуецца на этнічную культуру з апорай на родную мову як важнейшы сродак развіцця дзіцяці.

Мова разглядаецца з двух бакоў: з аднаго – як складальнік культуры, з другога – форма існавання духоўнай культуры народа. Маўленчае развіццё дашкольнікаў адбываецца ў сітуацыі блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму. Білінгвальная адукацыя забяспечвае паўнавартаснае развіццё асобы дзіцяці сродкамі дзвюх моў і прадстаўленых імі культур. Авалоданне беларускай мовай паралельна з рускай спрыяе фарміраванню нацыянальнай

самасвядомасці дзіцяці, пашырае светапогляд, павялічвае патэнцыяльныя маўленчыя магчымасці [2].

Этнакультурнае ўзбагачанае развіццёвае асяроддзе ўстановы дашкольнай адукацыі мае дастатковыя магчымасці для далучэння выхаванцаў да роднай мовы, нацыянальнай культурнай спадчыны. Узнікае неабходнасць узбагаціць выхавальнікаў пэўнымі ведамі, уменнямі і навыкамі ў гэтай галіне, што будзе садзенічаць арганізацыі эфектыўнай працы. Адсюль асаблівая ўвага павінна надавацца этнакультурнай падрыхтоўцы педагогаў установаў дашкольнай адукацыі, фарміраванню іх этнапедагагічнай культуры.

На думку В.С. Болбаса, «этнапедагагічная культура прадугледжвае прафесійную адукацыю і валоданне этнапедагагічнымі тэхналогіямі» [1, с. 26]. Аналіз прац шматлікіх даследчыкаў дазваляе канстатаваць, што метадалогія фарміравання этнапедагагічнай культуры ўключае чатыры кампаненты:

1. *кагнітыўны*, які можа быць прадстаўлены філасофскім асэнсаваннем і ведамі традыцый народнай культуры, этнічнай педагогікі і псіхалогіі;
2. *эмацыянальна-каштоўнасны* – маральна-этнічная накіраванасць свядомасці, асэнсаванне значнасці этнапедагагічнай дзейнасці ў адукацыі;
3. *дзейнасны* – грунтуецца на этнакультурных уменнях і навыках, вопыце этнакультурнай дзейнасці, сістэматычнай этнапедагагічнай адукацыі;
4. *прафесійна-асобасны* – этнічныя якасці, маральна-псіхалагічная гатоўнасць.

Сярод асноўных накірункаў фарміравання этнапедагагічнай культуры педагогаў вылучаюць:

− «вывучэнне гісторыі культуры Беларусі, народных звычаяў і традыцый, нацыянальнага характару беларусаў, развіццё нацыянальнай самасвядомасці;

− знаёмства з асаблівасцямі, зместам, прынцыпамі, метадамі і сродкамі выхавання народнай педагогікі беларусаў;

− выпрацоўка творчых падыходаў да асэнсавання народна-педагагічнага вопыту, фарміраванне ўменняў і навыкаў выкарыстання народна-педагагічных падыходаў у выхаванні;

− фарміраванне патрэбнасна-матывацыйнай сферы этнапедагагічнай дзейнасці» [1, с. 25].

Этнапедагагічная культура выхавальніка ўстановы дашкольнай адукацыі характарызуецца тэарэтычнай і практычнай гатоўнасцю да інтэграцыі ідэй этнічнай педагогікі і этнічнай культуры ў адукацыйную прастору сучаснай дашкольнай установы. Этнапедагагічная культура прадстаўляе сабой інтэграваную характарыстыку, якая грунтуецца на інфармацыйнай, эмацыянальна-каштоўнаснай і практычнай складовых. Інфармацыйная складовая характарызуецца веданнем: сутнасці сучаснай этнакультурнай адукацыі; сродкаў, метадаў і прыёмаў выхавання дзяцей у полікультурным асяроддзі; этнічнай гісторыі і культуры беларусаў, традыцый

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і звычаяў; канцэпцый этнакультурнага выхавання дашкольнікаў; прынцыпаў далучэння выхаванцаў да этнічнай культуры ва ўмовах блізкароднаснага білінгвізму.

Эмацыянальна-каштоўнасная складовая ўключае: перакананне выхавальніка ў неабходнасці захавання і перадачы этнакультурнай спадчыны дашкольнікам; гатоўнасць да інтэграцыі этнакультурных традыцый з сучасным адукацыйным працэсам установы дашкольнай адукацыі; актыўную пазіцыю педагога па распаўсюджванні і перадачы вопыту этнакультурнай дзейнасці.

Практычная складовая прадстаўлена: мадэліраваннем этнакультурна ўзбагачанага асяроддзя ва ўмовах установы дашкольнай адукацыі; падборам і распрацоўкай дыдактычнага матэрыялу па этнічнай гісторыі і культуры для дашкольнікаў; арганізацыяй і правядзеннем беларускамоўнага дня ў дашкольнай установе; арганізацыяй узаемадзеяння з бацькамі па этнавыхаванні дзяцей; актыўным удзелам у этнакультурных мерапрыемствах установы адукацыі і па-за яе межамі.

З мэтай этнакультурнай падрыхтоўкі педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі выкладчыкамі кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі (ІПКіП) БДПУ распрацаваны навучальны курс «Арганізацыя беларускамоўнага дня ва ўстанове дашкольнай адукацыі шляхам далучэння дашкольнікаў да культурнай спадчыны беларусаў». Навучальны курс складаецца з асноўнага і варыятыўнага модуляў *(см. Таблицу 1)*. Асноўны модуль накіраваны на развіццё прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў па праблеме арганізацыі беларускамоўнага дня ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання шляхам далучэння дашкольнікаў да культурнай спадчыны беларусаў. У працэсе рэалізацыі курса асноўная ўвага аўтараў накіравана на вырашэнне наступных адукацыйных задач:

– садзейнічаць актуалізацыі, узбагачэнню і паглыбленню ведаў педагогаў пра асаблівасці арганізацыі беларускамоўнага дня ва ўстанове дашкольнай адукацыі;

– садзейнічаць засваенню слухачамі спосабаў адбору зместу, эфектыўных форм, метадаў і прыёмаў далучэння дашкольнікаў да этнакультурнай спадчыны;

– стварыць умовы для ўзбагачэння выхавальнікаў спосабамі мадэліравання адукацыйнай прасторы этнакультурнага зместу ва ўмовах дашкольнай установы (у працэсе спецыяльна арганізаванай і нерэгламентаванай дзейнасці дашкольнікаў);

– стварыць умовы, накіраваныя на асобасна-прафесійную самаадукацыю педагогаў, прафесійнае станаўленне (этнакампетэнтнаснае, этнасацыяльнае, этнастваральнае).

Варыятыўны модуль прадстаўляе магчымасць удзельнікам навучальнага курса пазнаёміцца з актуальнымі сродкамі этнакультурнага выхавання дзяцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Табліца 1 – Вучэбна-тэматычны план курса**
**«Арганізацыя беларускамоўнага дня ва ўстанове**
**дашкольнай адукацыі шляхам далучэння**
**дашкольнікаў да культурнай спадчыны беларусаў»**

| №<br>п/п | Тэма | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго | Лекцыя | Практ. |
| | *Асноўная частка* | | | |
| 1. | Маўленчае развіццё дашкольнікаў у сітуацыі руска-беларускага двухмоўя | 2 | 1 | 1 |
| 2. | Спецыфіка навучання дзяцей дашкольнага ўзросту беларускай мове як роднай | 2 | 1 | 1 |
| 3. | Мадэліраванне этнакультурна ўзбагачанай адукацыйнай прасторы ва ўмовах установы дашкольнай адукацыі | 4 | | 4 |
| 4. | *Варыятыўная частка* | *4* | | *4* |
| 5. | Этнакультурнае выхаванне дашкольнікаў сродкамі народнага лялечнага тэатра | 4 | | 4 |
| 6. | Этнакультурнае выхаванне дашкольнікаў сродкамі музейнай педагогікі | 4 | | 4 |
| 7. | Этнакультурнае выхаванне дашкольнікаў сродкамі каляндарна-абрадавай дзейнасці | 4 | | 4 |
| 8. | **Усяго** | **12** | **2** | **10** |

Вынікам навучальнага курса стане авалоданне педагогамі спосабамі арганізацыі беларускамоўнага дня ва ўстанове дашкольнай адукацыі з рускай мовай навучання і выхавання, формамі і метадамі далучэння дашкольнікаў да этнакультурнай спадчыны ў працэсе спецыяльна арганізаванай і нерэгламентаванай дзейнасці.

Такім чынам, павышэнне кваліфікацыі педагогаў устаноў дашкольнай адукацыі накіравана на іх этнакультурную падрыхтоўку. Распрацаваны адукацыйны курс «Арганізацыя беларускамоўнага дня ва ўстанове дашкольнай адукацыі шляхам далучэння дашкольнікаў да культурнай спадчыны беларусаў» забяспечыць выхавальнікам узбагачэнне інфармацыйнай, эмацыянальна-каштоўнаснай і практычнай складовых этнапедагагічнай культуры.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Болбас, В. С. Фарміравнне этнапедагагічнай культуры будучых настаўнікаў / В. С. Болбас // Адукацыя і выхаванне. – 2009. – № 10 – С. 22–29.

2. Старжынская, Н. С. Развіцце беларускага маўлення дашкольнікаў ад 4 да 7 гадоў : вучэб.-метад. дапам. для педагогаў устаноў дашк. адукацыі з рус. мовай навучання / Н. С. Старжынская, Д. М. Дубініна. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – 184 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ